Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА “Беларускі дзяржаўны універсітэт
культуры і мастацтваў ”
___________________Ю.П.Бондар
“____”________________2010 г.
Рэгістрацыйны № ВД-___ / баз.

# СПЕЦІНСТРУМЕНТ
(скрыпка)

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01- 02*
*Народная творчасць (інструментальная музыка)*

Мінск 2010

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнік**

*Н.Б.Смольская-Зяневіч,* старшы выкладчык кафедры народна-інструментальнай творчасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”

**Рэцэнзенты:**

*Л.І.Чарняк,* дацэнт кафедры струнных народных інструментаў установы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі”;

*М.В.Бялова,* дацэнт кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

кафедрай народна-інструментальнай творчасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 2 ад 23.10.2009 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 2 ад 10.11.2009 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В.Б.Кудласевіч*
Адказны за выпуск *Н.Б.Смольская-Зяневіч*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вядучая роля ў працэсе выхавання будучых выканаўцаў, педагогаў і кіраўнікоў музычных калектываў належыць заняткам у спецыяльным класе. Менавіта тут адбываецца станаўленне мастацкай індывідуальнасці студэнта, тут ён атрымлівае моцны імпульс да творчай актыўнасці; у класе набывае развіццё яго музычнае мысленне, фарміруецца мастацкі густ, выхоўваюцца навыкі самастойнай работы над інтэрпрэтацыяй музычнага твора.

Веды і навыкі, якія набывае студэнт у працэсе навучання ў класе спецінструмента маюць непасрэдную сувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі – дырыжыраваннем, аркестравым класам, камерным і інструментальным ансамблямі.

*Мэтай* навучання ва ўстанове адукацыі мастацкага профілю з'яўляецца падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія творча валодаюць музычна-выканальніцкім майстэрствам, неабходным для самастойнай прафесійнай дзейнасці ў якасці кіраўніка музычнага калектыву, выкладчыка.

На працягу ўсяго перыяду навучання студэнт павінен авалодаць асноўнымі прынцыпамі і прыёмамі выканання скрыпічнага рэпертуару ў адпаведнасці з раздзеламі вывучэння курса. Для гэтага вырашаюцца наступныя *задачы:*

– адкарэкціраваць скрыпічную пастаноўку;

– засвоіць сродкі выразнасці скрыпічнага выканаўства;

– развіць тэхнічныя навыкі і прыёмы прафесійнага выканальніцкага майстэрства;

– выхаваць пачуццё адзінства музычна-тэхнічнага і мастацка-вобразнага ў працэсе скрыпічнага выканаўства;

– вывучыць адпаведны скрыпічны рэпертуар як аснову фарміравання музычнага светапогляду выканаўцы.

Падчас работы ў класе скрыпкі выкладчык выкарыстоўвае сучасную метадычную літаратуру, “анатама-фізіялагічны” і “псіхатэхнічны” метады навучання, камп'ютэрныя тэхналогіі і аўдыёвізуальныя сродкі, у тым ліку навучальныя камп'ютэрныя праграмы, відэа- і аўдыёзапісы, што дазваляе лепш засвоіць вучэбны матэрыял, забяспечыць паступовасць і паслядоўнасць навучальнага працэсу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выпускнік павінен *ведаць:*

– сутнасць сольнага выканання (сола, сола ў суправаджэнні фартэпіяна, сола ў суправаджэнні інструментальнага ансамбля);

– паслядоўнасць этапаў работы над музычнымі творамі;

– спецыфічныя штрыхі і прыёмы гуказдабывання;

– функцыянальныя мастацка-выразныя магчымасці скрыпкі;

*быць здольным:*

– распрацоўваць планы работы над музычнымі творамі і неабходным інструктыўным матэрыялам (практыкаванні, гамы, эцюды);

– выканаць неабходную карэктуру па дасягненні дакладнага інтанавання, збалансаванні дынаміка-акустычнага гучання ў працэсе сумеснага выканання твора ў суправаджэнні фартэпіяна ці ў складзе ансамбля;

– вызначыць спецыфіку пабудовы фразіроўкі, а таксама матываў, кантрапункта, расшыфраваць і дакладна выканаць музычную арнаментыку.

Сістэматычная работа над узбагачэннем тэхнічных навыкаў студэнта, развіццём яго выканальніцкага майстэрства з'яўляецца неабходнай часткай вучэбнага працэсу. У гэтай сувязі праграма прадугледжвае правядзенне на I курсе абавязковых тэхнічных залікаў з выкананнем гам і эцюдаў.

Выхаванню і фарміраванню будучага музыканта-педагога, кіраўніка музычнага калектыву спрыяе развіццё музычна-выканальніцкага і метадычна-педагагічнага мыслення студэнта, якое выкладчык ажыццяўляе праз вывучэнне ў класе разнастайнай музычнай і музычна-метадычнай літаратуры, інструктыўна-тэхнічнага матэрыялу. Работа студэнта ў спецыяльным класе кантралюецца на акадэмічных канцэртах, тэхнічных заліках, семестравых, пераводных і дзяржаўных экзаменах. Усяго прадугледжана 654 гадзіны, з іх 276 аўдыторных, якія з'яўляюцца індывідуальнымі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўд. гадзін (інд.заняткі) |
|---|---|
| **Раздзел I. Скрыпічная пастаноўка** | |
| ***Тэма 1.*** Агульныя прынцыпы пастаноўкі скрыпача | 1 |
| ***Тэма 2.*** Сістэма пастаноўкі рук скрыпача і структура рухаў | 3 |
| **Раздзел II. Сродкі выразнасці скрыпічнага выканаўства** | |
| ***Тэма 3.*** Інтанацыя | 14 |
| ***Тэма 4.*** Рытм | 12 |
| ***Тэма 5.*** Дынаміка | 8 |
| ***Тэма 6.*** Фразіроўка | 10 |
| ***Тэма 7.*** Гукаўтварэнне і культура гуку | 12 |
| **Раздзел III. Выхаванне і развіццё тэхнічных навыкаў і прыёмаў прафесійнага выканальніцкага майстэрства** | |
| ***Тэма 8.*** Тэхніка левай рукі | 16 |
| ***Тэма 9.*** Тэхніка правай рукі | 10 |
| ***Тэма 10.*** Штрыхі | 10 |
| ***Тэма 11.*** Аплікатура і аплікатурная эстэтыка | 6 |
| ***Тэма 12.*** Вібрата | 8 |
| **Раздзел IV. Адзінства музычна-тэхнічнага і мастацка-вобразнага ў працэсе скрыпічнага выканаўства** | |
| ***Тэма 13.*** Змястоўны аналіз музычнага твора і вывучэнне гісторыка-культурнага кантэксту | 4 |
| ***Тэма 14.*** Выпрацоўка цэласнага ўяўлення аб музычным творы і інтэрпрэтацыйнай канцэпцыі | 6 |
| ***Тэма 15.*** Пабудова выканальніцкага вобраза | 8 |
| ***Тэма 16.*** Выбар тэхнічных сродкаў музычнай выразнасці | 8 |
| ***Тэма 17.*** Фарміраванне індывідуальнага стылю выканаўцы | 8 |
| **Раздзел V. Рэпертуар як аснова фарміравання музычнага светапогляду выканаўцы** | |
| ***Тэма 18.*** Арганізацыя працэсу вывучэння музычнага твора | 4 |
| ***Тэма 19.*** Вывучэнне інструктыўнага матэрыялу | 12 |
| ***Тэма 20.*** Творы малой формы | 24 |
| ***Тэма 21.*** Творы буйной формы | 60 |
| ***Тэма 22.*** Работа над увасабленнем мастацкага зместу твора | 32 |
| Усяго… | 276 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ КУРСА

## Раздзел I. Скрыпічная пастаноўка

### *Тэма 1. Агульныя прынцыпы пастаноўкі скрыпача*

Асновы агульнай пастаноўкі. Аптымальная пастаноўка як передумова прафесійнага выканання. Апорна-рухальная сістэма чалавека і становішча корпуса скрыпача падчас выканання. Работа над дасягненнем поўнай свабоды і разняволення апарату выканаўцы, выпрацоўка адэкватных адчуванняў. Акадэмічная і народная пастаноўка.

### *Тэма 2. Сістэма пастаноўкі рук скрыпача і структура рухаў*

Мышачна-рухальны апарат чалавека і анатама-фізіялагічныя ўласцівасці рук. Індывідуальныя асаблівасці плечавога пояса, рук выканаўцы і індывідуалізацыя працэсу пастаноўкі. Аптымальнае размеркаванне рабочай нагрузкі паміж локцевым суставам і перадплеччам у працэсе выканання. Адносная незалежнасць і каардынацыя дзейнасці рук скрыпача ў працэсе выканання. Функцыя і пастаноўка левай рукі. Функцыя і пастаноўка правай рукі.

## Раздзел II. Сродкі выразнасці скрыпічнага выканаўства

### *Тэма 3. Інтанацыя*

Інтанацыйная прырода музыкі. Віды музычнай інтанацыі. Заканамернасці мастацка-выразнага інтанавання: ладагарманічная сістэма; спецыфіка натуральнага (піфагоравага) строю; меладычнае і гарманічнае інтанаванне; тэмбравыя, дынамічныя, тэмпавыя, рэгістравыя характарыстыкі інтанацыі. Праблемы аб’ектыўнага і суб’ектыўнага характару ў інтанаванні на струнных смычковых інструментах. Зонная прырода музычнага слыху. Прынцыпы работы над інтанацыяй у сольным і ансамблевым выкананні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 4. Рытм*

Уяўленне аб музычным рытме і яго адрозненні ад рытму ў навакольным свеце і ў іншых відах мастацтва. Маторная прырода музычнага рытму. Рытм як аснова выканальніцкай тэхнікі. Узаемасувязь рытму і тэмпу. Выяўленчыя магчымасці рытму. Выхаванне рытмічнай дысцыпліны.

### *Тэма 5. Дынаміка*

Дынаміка: шырокае і вузкае разуменне сутнасці з'явы. Дынамічныя сродкі ў кантэксце музычнага стылю і мастацка-вобразнага зместу твора. Прыёмы і спосабы выканання дынамічных указанняў.

### *Тэма 6. Фразіроўка*

Фразіроўка. Вызначэнне раздзелаў музычнай формы і іх межавання. Аб'яднанне і дзяленне музычных фраз і сказаў. Музычная пунктуацыя. Вызначэнне сэнсавых акцэнтаў і кульмінацыі. Узаемасувязь інтанацыйна-меладычных, тэмпарытмічных і дынамічных сродкаў у працэсе працы над фразіроўкай.

### *Тэма 7. Гукаўтварэнне і культура гуку*

Гукаўтварэнне і культура гуку. Уплыў тэхнічных фактараў (хуткасці руху, сілы націску і пункта дотыку смыка) на якасць гуку. Тэмбравыя, дынамічныя і інтанацыйныя характарыстыкі гуку. Вібрата і партамента, атака і філіроўка гуку. Спосабы злучэння гукаў: змена смыка, пазіцыйныя пераходы, пераходы ад струны да струны, паняцце гукавога фону.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Выхаванне і развіццё тэхнічных навыкаў і прыёмаў прафесійнага выканальніцкага майстэрства

### *Тэма 8. Тэхніка левай рукі*

Засваенне навыкаў выканання на аснове “анатама-фізія-лагічнага” метаду адпрацоўкі рухальных прыёмаў у гарманічным спалучэнні з “псіхатэхнічным” метадам слыхавых уяўленняў. Рух як аснова тэхнікі левай рукі скрыпача, пасажная тэхніка. Узаемасувязь рухаў пальцаў, кісці, перадплечча і пляча (“рулявыя рухі”). Пазіцыі і іх змяненне. Ціск на струны. Рухі пальцаў у двайных нотах і акордах. Развіццё бегласці ў каардынацыі з рухамі правай рукі, гамы і практыкаванні. Каларыстычныя прыёмы: арнаментыка, трэль, храматычныя глісанда, флажалеты, pizzicato левай рукой.

### *Тэма 9. Тэхніка правай рукі*

Тэхніка правай рукі і асновы гукаўтварэння. Асаблівасці пастаноўкі правай рукі ў адпаведнасці з мастацка-вобразнымі задачамі. Злучэнне струн у павольным і хуткім тэмпах. Спецыяльныя каларыстычныя прыёмы выканання: tremolo, sul tasto, sul ponticello, pizz. Тэхніка выканання акордаў у поліфанічнай і віртуознай фактуры.

### *Тэма 10. Штрыхі*

Выяўленчыя магчымасці штрыхоў. Вывучэнне і засваенне штрыхоў на аснове прынцыпу паслядоўнасці: вызначэнне і спосаб выканання. Выкарыстанне анатамічных асаблівасцей правай рукі ў працэсе выканання штрыхоў. Чатыры групы штрыхоў: працяжныя, пявучыя, плаўныя – дэташэ, легата; адрывістыя, ударныя – мартэле, цвёрдае стаката, штрых Віоці, адрывістыя, рэзкія акцэнты; вострыя, бліскучыя, палётныя – спіката, саціе, рыкашэт, лятучае стаката, трэмала, сальтанда; змешаныя штрыхі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 11. Аплікатура і аплікатурная эстэтыка*

Аплікатура і аплікатурная эстэтыка. Тэхналагічная аплікатура. Асноўныя прынцыпы падбору аплікатуры. Выхаванне аплікатурнай свядомасці і індывідуальнага аплікатурнага стылю. Аплікатура пазіцыйная, міжпазіцыйная і непазіцыйная. Аплікатура як сродак жанравай інтэрпрэтацыі.

### *Тэма 12. Вібрата*

Вібрацыя як прыём выканання, сродак музычнай выразнасці і навык, адзін з важнейшых элементаў выканальніцкага майстэрства скрыпача, які ўплывае на тэмбр, гучнасць, гукавышыннасць. Чатыры асноўныя формы вібрата (кісцевая, локцевая, пальцавая, змешаная). Параметры вібрата (частата ваганняў, амплітуда ваганняў, форма ваганняў). Рэгістр, тэмп і дынаміка – вызначальныя фактары характарыстыкі вібрата.

## Раздзел IV. Адзінства музычна-тэхнічнага і мастацка-вобразнага ў працэсе скрыпічнага выканаўства

### *Тэма 13. Змястоўны аналіз музычнага твора і вывучэнне гісторыка-культурнага кантэксту*

Мастацкая канцэпцыя музычнага твора. Вобразная сістэма і драматургія. Сістэма выразных сродкаў. Жанр: вызначэнне жанру, стылявыя жанравыя асаблівасці. Форма і архітэктоніка твора: простыя формы, буйныя формы. Стыль: вызначэнне стылю, стыль і эпоха, выразныя сродкі. Асацыятыўныя сувязі.

### *Тэма 14. Выпрацоўка цэласнага ўяўлення аб музычным творы і інтэрпрэтацыйнай канцэпцыі*

Семантычная структура музычнага твора. Паняцці нотнага запісу і мастацкага тэксту. Нотны тэкст як агульны план, мадэль музычнага твора. Мастацкі тэкст як музычны код і сістэма мастацкіх значэнняў і сэнсаў, якая развіваецца ў сацыя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гістарычным часе (тэкст, падтэкст, кантэкст). Расшыфроўка, пераінтанаванне і трансфарміраванне нотнага матэрыялу.

### *Тэма 15. Пабудова выканальніцкага вобраза*

Выканальніцкі план і метады яго ўвасаблення ў жывым гучанні. Паглыбленне ў мастацкі тэкст і ўдакладненне задумы. Дэталізацыя і дасягненне цэласнасці. Два аспекты музычнага твора: унутраныя музычныя ўяўленні выканаўцы і знешні працэс набліжэння гучання да гукавога ідэалу. Паняцце аб'ёму мастацкага вобраза. Аўтарскі, выканальніцкі і слухацкі вобразы.

### *Тэма 16. Выбар тэхнічных сродкаў музычнай выразнасці*

Адзінства тэхнікі і музыкі: выбар тэхнічных сродкаў музычнай выразнасці ў адпаведнасці з характарам музыкі, яе эмацыянальным строем, гукавымі параметрамі, жанравымі і нацыянальнымі стылявымі асаблівасцямі. Узаемазалежнасць і ўзаемаабумоўленасць інтанацыйна-выразных, тэмбравых, дынамічных, рэгістравых, тэмпавых сродкаў. Адбор адэкватных сродкаў і рашэнняў (характар штрыхоў і пераходаў, адценні вібрата і атакі гуку, аплікатура).

### *Тэма 17. Фарміраванне індывідуальнага стылю выканаўцы*

Агульная і музычная эрудыцыя як фактар фарміравання індывідуальнага стылю выканаўцы. Сталасць светапогляду музыканта – аснова арыгінальнасці інтэрпрэтацыйнай канцэпцыі выканаўцы. Выхаванне асобы і тэхнічная дасканаласць у працэсе фарміравання індывідуальнага стылю выканаўцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел V. Рэпертуар як аснова фарміравання музычнага светапогляду выканаўцы

### *Тэма 18. Арганізацыя працэсу вывучэння музычнага твора*

Улік індывідуальных асаблівасцей, ступені адоранасці, музычнага развіцця, спецыяльнай падрыхтоўкі студэнтаў пры падборы мастацкага рэпертуару. Састаўленне індывідуальных рэпертуарных планаў для кожнага студэнта. Лагічная паслядоўнасць у выбары рэпертуару. Абавязковае ўключэнне ў рэпертуар розных па змесце, форме і стылю твораў беларускай музыкі. Наданне вызначанай ступені самастойнасці студэнтам пры складанні рэпертуарных планаў. Развіццё ініцыятыўнасці, пластычнасці музычнага мыслення студэнтаў пры планаванні і фарміраванні працэсу вывучэння музычнага твора.

### *Тэма 19. Вывучэнне інструктыўнага матэрыялу*

Мажорныя і мінорныя гамы, храматычная гама, арпеджыо, эцюды.

Работа над эцюдамі, гамамі і іншым вучэбна-дапаможным матэрыялам – важнае звяно ў вучэбным працэсе. Спалучэнне іх мастацкай значнасці з мэтазгоднасцю вывучэння для развіцця тых або іншых выканальніцкіх навыкаў.

Розныя формы вывучэння эцюдаў у залежнасці ад зместу і характару вучэбных задач. Давядзенне выканання эцюда да магчымай ступені завершанасці і выкарыстанне яго ў плане азнаямлення ці для чытання нот з ліста.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 20. Творы малой формы*

Творы малой формы беларускіх кампазітараў. Творы малой формы кампазітараў эпохі барока XVII–XVIII стст. Творы малой формы еўрапейскіх кампазітараў-класікаў XVIII–XIX стст. Творы малой формы заходнееўрапейскіх кампазітараў-рамантыкаў XIX ст. Творы малой формы рускіх кампазітараў XIX – пачатку XX ст. Творы малой формы кампазітараў XX – пачатку XXI ст.

### *Тэма 21. Творы буйной формы*

Творы буйной формы беларускіх кампазітараў. Творы буйной формы кампазітараў эпохі барока XVII–XVIII стст. Творы буйной формы еўрапейскіх кампазітараў-класікаў XVIII–XIX стст. Творы буйной формы заходнееўрапейскіх кампазітараў-рамантыкаў XIX ст. Творы буйной формы рускіх кампазітараў XIX – пачатку XX ст. Творы буйной формы кампазітараў XX – пачатку XXI ст.

### *Тэма 22. Работа над увасабленнем мастацкага зместу твора*

Дасканалае вывучэнне твора, гісторыка-культурнага кантэксту, творчага напрамку, індывідуальнага стылю аўтара як этап, неабходны для ўвасаблення мастацкага зместу твора. Пастаноўка галоўных мэт і выканальніцкіх задач, выпрацоўка на гэтай аснове выканальніцкага плана. Мадэль (цэласны вобраз) музычнага твора і асацыятыўны метад. Стварэнне ў свядомасці ўнутранай мадэлі выканання. Пошукі адэкватных сродкаў выразнасці для ўвасаблення выканальніцкай задумы. Аўтаматызацыя працэсу выканання на аснове гарманізацыі суадносін рацыянальна-лагічнага і эмацыянальна-вобразнага. “Архівацыя” і “кадыфікацыя” назапашаных прыёмаў і навыкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА


*Асноўная*

1. *Ауэр, Л.* Моя школа игры на скрипке. Интерпретация произведений скрипичной классики / Л.Ауэр; общ. ред., вступ. ст. и комментарии И.Ямпольского. – М., 1965. – 270 с.

2. *Берлянчик, М.* О развитии интонационного слуха исполнителя / М.Берлянчик // Вопросы воспитания музыкального слуха. – Л.: Музыка, 1987. – С. 20–43.

3. *Бернштейн, Б.* О построении движений / Б.Берштейн. – М.: Музгиз, 1947. – 68 с.

4. *Благовещенский, И.П.* Из истории скрипичной педагогики / И.П.Благовещенский. – Мн.: Вышэйш. шк., 1980. – 77 с.

5. *Верхолаз, Р.* Вопросы методики чтения нот с листа / Р.Верхолаз. – М.: Музыка, 1969. – 140 с.

6. *Гарбузов, Н.А.* Зонная природа звуковысотного слуха / Н.А.Гарбузов. – М.; Л.: Музгиз, 1948. – 56 с.

7. *Григорьев, В.Ю.* Самостоятельная работа по специальности: принципы и методы / В.Ю.Григорьев. – Л.: Музыка, 1979. – 78 с.

8. *Гутников, Б.* Об искусстве скрипичной игры / Б.Гутников. – Л.: Музыка, 1988. – 53 с.

9. *Либерман, М.* Культура звука скрипача: пути формирования и развития / М.Либерман, М.Берлянчик. – М., 1985. – 112 с.

10. *Мострас, К.Г.* Интонация на скрипке / К.Г.Мострас. – Л.: Музгиз, 1948. – 83 с.

11. *Мострас, К.Г.* Динамика в скрипичном искусстве / К.Г.Мострас. – Л.: Музгиз, 1956. – 47 с.

12. *Сраджев, В.* Еще раз о свободе игрового аппарата инструменталиста // В.Сраджев // Исполнительское искусство: виолончель, контрабас, арфа: сб. трудов. – М.: ГМПИ им. Гнесиных, 1992. – Вып. 119. – С. 80–101.

13. *Стахов В.* Сохранение и монтировка скрипки / В.Стахов. – Л.: Музыка, 1983. – 67 с.

14. *Струве, Б.* Вибрация как исполнительский навык игры на смычковых инструментах / Б.Струве. – Л.: Музгиз, 1933. – 85 с.

15. *Флеш, К.* Искусство скрипичной игры / К.Флеш. – М.: Классика-XXI, 2004. – 301 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*16. Хасанова, В.Н.* Музыкальный ритм / В.Н.Хасанова. – М.: Музыка, 1980. – 50 с.
*17. Ямпольский, И.* Основы скрипичной аппликатуры / И.Ямпольский. – М.: Музыка, 1965. – 190 с.

*Дадатковая*

1. *Анохин, П.К.* Очерки по физиологии функциональных систем / П.К.Анохин. – М.: Сов. композитор, 1975. – 254 с.
2. *Гольденвейзер, А.* О музыкальном исполнительстве. Из заметок старого исполнителя-пианиста / А.Гольденвейзер // Вопросы музыкально-исполнительского искусства. – М.: Музгиз, 1958. – Сб. 2. – 121 с.
3. *Мазель, Л.* Строение музыкальных произведений / Л.Мазель. – М.: Музыка, 1979. – 77 с.
4. *Шульпяков, О.Ф.* О психофизическом единстве исполнительского искусства / О.Ф.Шульпяков. – Л.: Сов. композитор, 1973. – 117 с.
5. *Юзефович, В.* Давид Ойстрах. Беседы с Игорем Ойстрахом / В.Юзефович. – М.: Музыка, 1978. – 315 с.
6. *Янкелевич, Ю.И.* Педагогическое наследие: антология / Ю.И.Янкелевич. – М.: Музыка, 2009. – 440 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**СПЕЦІНСТРУМЕНТ**
(скрыпка)

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць*
*напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01- 02*
*Народная творчасць (інструментальная музыка)*

Карэктар В.Б.Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2010 г. Фармат 60х84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 0,89. Ул.-выд. арк. 0,47.
Тыраж экз. Заказ

УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў".
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 02.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў".
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ